предположительно на расстоянии от -2 до 2 от существительного *шубка*. В результате обработки запроса корпусный менеджер выдает список из двух контекстов. Мы можем предположить, что в данном тексте А. Кушнер апеллирует к стихотворениям А. Ахматовой «Высоко в небе облачко серело...» и О. Мандельштама «Tristia». Ср.: *Высоко в небе облачко серело, Как* ***беличья*** *расстеленная* ***шкурка***; *Да будет так*: *прозрачная фигурка / На чистом блюде глиняном лежит, / Как* ***беличья*** *распластанная* ***шкурка****...*

Это лишь немногие примеры того, насколько полезны могут быть корпусные технологии в исследованиях в области интертекстуальности и прецедентности.

Библиографические ссылки

1. Зубов А. В. Алгоритм перевода терминологических словосочетаний с использованием параллельных текстов // Теория и практика перевода, 2005. № 1. С. 64–66.

2. Кушнер А. С. Живая изгородь. Л. : Сов. писатель, 1988. 144 с.

3. Чернявская В. Е. Лингвистика текста : Поликодовость, интертекстуальность, интердискурсивность : учеб. пособие. М. : ЛИБРОКОМ, 2009. 248 с.

Банько І. М. (Мінск)

Ужыванне прыназоўнікаў *у* і *на* ў некаторых канструкцыях: дублеты ці сінонімы?

Мэта артыкула − выявіць адрозненні ў значэнні, выкарыстанні і пашырэнні спалучэнняў з прыназоўнікамі *у, на, па, за* (накшталт *пайсці ў рыбу / на рыбу / па рыбу / за рыбай*) у розных тыпах дыскурсу: мастацкім, дыялектным, публіцыстычным.

Штуршком да даследавання такіх адзінак стаў фрагмент з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» (1923):

Пайсці ў грыбы ці ў тую ж рыбу,
Або паехаць у сялібу
Ці ў млын малоць на хлеб збажынку –
Ўсё гэта квапіла хлапчынку <...>.

Наколькі ўжывальнымі ў наш час з'яўляюцца спалучэнні *пайсці / паехаць у рыбу / у грыбы / у дровы* і пад. або яны цалкам замяняюцца спалучэннямі *на рыбу, па грыбы / за грыбамі, па дровы / за дровамі / дрывамі*? Як вызначаць такія спалучэнні: як дублетныя ці як сінанімічныя? Каб разважанні і высновы былі пераканальныя, ілюстрацыйны матэрыял выбіраўся з Беларускага N-корпуса [1] і акадэмічных тлумачальных слоўнікаў беларускай мовы.

Як сведчыць электронны рэсурс, спалучэнне *ісці / хадзіць у рыбу* ў мастацкіх творах уласцівае не толькі Я. Коласу, але і іншым беларускім пісьменнікам, параўн.: ***Пайду*** *з арганістам і Лыганоўскім*

у рыбу (У. Караткевіч «Чорны замак Альшанскі»); *Лічы, што я на яцвяжскія азёры* ***ў рыбу пайшоў*** (Л. Дайнека «След ваўкалака»); *Бацька са сваім суседам* ***хадзіў*** *час ад часу* ***ў рыбу*** (У. Дубоўка «Пялёсткі»); *Сядзелі, сядзелі, пакуль мо мазалі не нараслі, кінулі ды* ***ў рыбу падаліся*** <…> (Г. Марчук «Новыя прыгоды Несцеркі») [1]. Аднак частотнасць ужыванняў названай адзінкі несуразмерна саступае спалучэнню з прыназоўнікам *на*. Калі прывесці колькасныя звесткі па Беларускім N-корпусе, то суаднесенасць на гэты момант такая: 14 / 175.

Згодна з лексікаграфічнымі выданнямі, прыназоўнік *у* са словамі *грыбы, ягады, дровы* выкарыстоўваецца з вінавальным склонам «пры ўказанні на аб'ект мэты дзеяння (збору, нарыхтоўкі і пад.)» [4, с. 80]. Адсюль становіцца відавочным, што прыназоўнік *у* ўжываецца пры абазначэнні аб'екта мэты, на які накіравана актыўнае дзеянне суб'екта – 'збіранне з мэтай нарыхтоўкі'. Гэты факт пацвярджаецца і аналагічнымі спалучэннямі з назоўнікамі, што абазначаюць прадметы (плады, расліны, ягады і пад.), якія можна сабраць у лесе ці полі: *пайсці ў арэхі / у шчаўе / у крапіву / у ахрап'е / у маліны / у ажыны / у суніцы / у апенькі*, але не **у клубніцы / *у пятрушку / *у радыску / *у памідоры*, г. зн., што хадзілі нарыхтоўваць тое, што не расце ў сваім садзе ці гародзе. Можна меркаваць, што *пайсці / хадзіць у рыбу* мае такое ж «нарыхтоўчае» значэнне, калі гаворка ідзе менавіта пра лаўленне рыбы на рацэ ці возеры з дапамогай вуды, як гэта было раней у беларусаў (*вудзіць рыбу*), і калі гэта было пэўнай падтрымкай у харчаванні сям'і.

Пра пашыранасць форм з прыназоўнікам *у* ў спалучэннях са словамі *ягады, грыбы, дровы* ў значэнні мэты сведчыць «Дыялекталагічны атлас беларускай мовы» (1963). Паводле ўкладзеных картаў № 213–216 (арэалу пашырэння) гэтыя формы (на момант палявых збораў – сярэдзіна XX ст.) выкарыстоўваліся амаль на ўсёй тэрыторыі Беларусі, за выключэннем гродзенска-баранавіцкіх гаворак, мазырскай групы гаворак, заходняй часткі палескай і часткова слуцкіх груп гаворак. Праўда, у анкету не ўваходзіла спалучэнне *пайсці ў рыбу*.

Між тым даследчыкі адзначаюць і спалучэнне *паехаць у ловы*, якое ўжывалася ў старабеларускай мове, калі верыць прыкладам з інтэрнэту: *Даўней князі «забаўляліся ловамі», або* ***ездзілі «ў ловы»*** *(на паляванне). Потым Гедымін,* ***заехаўшы ў ловы****, звыклым абычаем чыніў воступы над берагамі ракі Вільні* («Хроніка літоўская і жамойцкая») [1]; і якое можа выкарыстоўвацца з мэтай гістарычнай стылізацыі мастацкага тэксту, напр., у рамане У. Караткевіча сустракаем: «*Ды нашто ж, найяснейшы? Калі вы завіталі ў маю сціплую камяніцу, то давайце або мы вас пакінем з намі ў табары, а раніцай разам* ***у ловы****…*» («Чорны замак Альшанскі»). Калі разглядаць гэтае спалучэнне ў адным шэрагу

з вышэйназванымі адзінкамі пры дзеясловах мэтанакіраванага дзеяння, то яно дастаткова спрэчнае з пункту гледжання семантыкі. Калі б гаворка ішла пра простых людзей, то яны, відаць, *хадзілі ў ловы* (напр., лавілі ў пасткі зайцоў ці каго яшчэ) з мэтай нарыхтоўкі; а паны / князі, відаць, маглі толькі *ездзіць у ловы*, але з іншай мэтаю – дзеля забавы, баўлення часу, палявання. Можа, таму форма з прыназоўнікам *на* больш частотная: − *Ці не* ***на ловы сабраўся****, васпане? – пажартаваў Лісоўскі. – Але ж мы на вайну ідзём, а не* ***на ловы*** (Л. Дайнека «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка»). Спалучэнні *ў ловы* і *на ловы* ў Беларускім N-корпусе колькасна суадносяцца 3 / 33 адпаведна. Як адзначалася вышэй, спалучэнне *на рыбу* таксама з'яўляецца больш ужывальным, чым *у рыбу*; так, Р. Барадулін канстатаваў: *у нас кажуць дасюль:* ***пайсьці на рыбу, у ягады, у грыбы*** (Р. Барадулін «Здубавецця»).

Ва ўжыванні прыназоўнікаў *у* і *на* з вінавальным склонам са значэннем мэты або *за* з творным склонам ў спалучэнні са словам *дровы* адлюстраваны іншы арэал пашырэння ў дыялектнай мове [3]. Формы з прыназоўнікам *па* сустракаюцца практычна на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Канструкцыя *ў дровы* характэрна для паўночна-ўсходняга дыялекту, часткова сярэднебеларускіх гаворак і паўночна-заходняга дыялекту (гродзенска-баранавіцкія і слуцкія гаворкі), у адзінкавых выпадках сустракаецца ў палескай групе гаворак. Форма *за дрывамі* была пашырана ў паўночна-ўсходнім дыялекце і палескай групе гаворак, спарадычна выкарыстоўвалася на ўсёй тэрыторыі Беларусі.

У творах мастацкай літаратуры сустракаюцца ўсе тры формы (прычым могуць быць у аднаго і таго ж аўтара): <...> *Але Петрака цяпер не было і саней не было пры хляве – ці не* ***паехаў па дровы****?* (В. Быкаў «Знак бяды»); *Там яны зрабілі пад елкай будан, у якім пракалаціліся на сцюжы два дні і дзве ночы, даелі апошні кавалак хлеба, што* ***бралі*** *з сабой* ***у дровы*** (В. Быкаў «Воўчая зграя»); *Уставай і* ***давай за дрывамі*** (В. Быкаў «Ваўчыная яма»). У Беларускім N-корпусе канструкцыя *па дровы* прадстаўлена 135 разоў, *у дровы* – 17, *за дровамі* – 7, *за дрывамі* – 5.

Падсумоўваючы, можна сказаць, што спалучэнні *пайсці / паехаць у рыбу / на рыбу, у ловы / на ловы, у дровы / па дровы / за дровамі / за дрывамі* будуць з'яўляцца (у большасці сваёй) сінонімамі, а не дублетамі, бо яны маюць адрозненні ў семантыцы. Так, канструкцыя *пайсці ў рыбу* па аналогіі з іншымі спалучэннямі (*у ягады, у грыбы, у шчаўе*) абазначала лоўлю 'з мэтай нарыхтоўкі', а форма *на рыбу*, як можна дапусціць, па аналогіі са спалучэннем *на паляванне* атрымала іншае значэнне: з аднаго боку, лоўля рыбы стала хобі, спосабам адпачынку, а з другога боку, сёння рыбу ловяць вельмі дасканалымі

прыладамі. Формы *у ловы / на ловы*, думаецца, не зусім тоесныя семантычна, бо *ездзіць на ловы* хутчэй абазначае занятак дзеля баўлення часу або промыслу. Спалучэнні *ў дровы / па дровы*, як было засведчана ў Дыялекталагічным атласе, дыферэнцыруюцца паводле семантыкі: паехаць *у дровы* ‘калі іх трэба нарэзаць ці насячы’, а *па дровы* – ‘забраць гатовыя’ [2, с. 760–761]. Словазлучэнні тыпу *ісці па дровы* і *ісці за дрывамі / за дровамі* правамерна лічыць дублетнымі, бо яны не адрозніваюцца значэннем.

З прааналізаваных матэрыялаў Беларускага N-корпуса вынікае, што канструкцыі з прыназоўнікам *у* менш пашыраныя і ў мастацкіх, і ў публіцыстычных тэкстах (*у ловы* – 3, *у рыбу* – 14, *у дровы* – 17 і разам з тым *на ловы* – 35, *па дровы* – 135, *на рыбу* – 175). Можна дапусціць, што такія словазлучэнні, як *пайсці ў рыбу / у ловы / у дровы* абазначаюць з’явы, якія паступова страчваюць сваю актуальнасць, таму што, як правіла, гэтага не робяць ужо з мэтай нарыхтоўкі, як было раней. Мова мастацкай літаратуры і публіцыстыка адлюстроўваюць рэальнае ўжыванне моўных адзінак у грамадстве, таму прыназоўнік *у* ў названых спалучэннях выкарыстаны ў творах пісьменнікаў старэйшага пакалення (Я. Колас, У. Дубоўка і інш.) або пры стылізацыі на гістарычную тэматыку (У. Караткевіч, Л. Дайнека і інш.).

Што датычыць словазлучэнняў *пайсці / паехаць у грыбы, у ягады*, то па частотнасці ўжывання ў Беларускім N-корпусе дамінуе форма *ў грыбы*, а спалучэнне *ў ягады* саступае форме *па ягады*: *у грыбы* − 343, *у ягады* − 88 і *па грыбы* − 166, *па ягады* − 100, *за грыбамі* − 23, *за ягадамі* − 6. Адсюль вынікае, што прыназоўнік *у* найбольш пашыраны ў канструкцыі *пайсці / паехаць у грыбы*.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Беларускі N-корпус [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу : http://bnkorpus.info. Дата доступу : 22.02.2019.

2. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы : уступныя артыкулы, даведачныя матэрыялы і каментарыі да карт / Р. І. Аванесаў [і інш.] ; АН БССР, Ін-т мовазнаўства ім. Я. Коласа ; пад. рэд. Р. І. Аванесава, К. К. Крапівы, Ю. Ф. Мацкевіч. Мінск : АН БССР, 1963. 969 с. [338 карт].

3. Дыялекталагічны атлас беларускай мовы [Карты] / Р. І. Аванесаў [і інш.] ; АН БССР, Ін-т мовазнаўства ім. Я. Коласа ; пад. рэд. Р. І. Аванесава, К. К. Крапівы, Ю. Ф. Мацкевіч. Мінск : АН БССР, 1963. 338 карт.

4. Канюшкевіч М. І. Беларускія прыназоўнікі і іх аналагі. Граматыка рэальнага ўжывання. Матэрыялы да слоўніка. У 3 ч. Ч. 3. Дыяпазон Р – Я / М. І. Канюшкевіч. Гродна : ГрДУ, 2010. 535 с.